# КАДРАВЫ ДЗЕНЬ У ПАЛАЦЫ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ



**Учора Прэзідэнт прызначыў новых кіраўнікоў — дзяржкамітэта, буйнога прадпрыемства, мясцовай вертыкалі. Яшчэ адно мерапрыемства з удзелам кіраўніка дзяржавы таксама можна назваць кадравым — Сяргей Глазьеў, з якім сустрэўся Аляксандр Лукашэнка, у хуткім часе зойме пасаду Дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы.**

(Падрабязнасці на стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
18 КРАСАВІКА 2025 г. ПЯТНІЦА № 76 (30464)





ПЯЦІГОДКА ЯКАСЦІ

## У РЫТМЕ СЭРЦА

**Чым унікальнае кардыяхірургічнае аддзяленне № 1 РНПЦ «Кардыялогія»?**



На лячэнне ў РНПЦ «Кардыялогія» накіроўваюць самых складаных пацыентаў з усёй краіны. Штогод тут выконваецца больш за 3,5 тысячы высокатэхналагічных аперацый на сэрцы і сасудах. Прычым перавага аддаецца малаінвазіўным аператыўным метадам лячэння, калі аперацыя праводзіцца праз невялікія разрэзы і праколы. Тое, што яшчэ дзесяціголдзе таму немагчыма было і ўявіць, сёння стала руціннымі хірургічнымі ўмяшаннямі.

СТАР. 10



+TV ПРАГРАМА

«ДЗЯДУЛЯ», «БАБУЛЯ»



ЧЫМ ЗДЗІВІЦЬ МІЖНАРОДНЫ ВЕЛІКОДНЫ ФЕСТЫВАЛЬ? 9



КРЫНІЦА ЗДАРОЎЯ І МАЛАДОСЦІ 15

БУДЗЕМ ВЫВУЧАЦЬ

## КРЭДЫТНАЯ ПЯТЛЯ

**Калі чалавек расплачваецца з карткі растэрміноўкі за фаст-фуд, ён проста не ўмее абыходзіцца з грашыма**

Неяк незаўважна падселі беларусы на крэдыты. Больш за палову ўжо абзавялося крэдытнымі дагаворамі. І пазычылі ўжо каля 40 мільярдаў рублёў. Сярэдні крэдыт — 7,6 тысячы рублёў. Гэта эквівалентна 3,3 сярэдняй намінальнай заработнай платы. У прынцыпе, зусім дробязь у параўнанні з некаторымі іншымі краінамі. Нямала амерыканцаў, ды і еўрапейцаў, ледзь не ўсё жыццё ў доўг жывуць. І нічога, не памерлі. Бяруць у крамах усё, што захочацца тут і цяпер. І выдатна «ўпакаваныя». Праўда, усё жыццё даўгі аддаюць. Значыць, сістэма працуе.

СТАР. 6–7



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X
25076>
9 771990 763008

# «МЫ ДАСТАТКОВА РАЗУМНЫЯ ЛЮДЗІ, СІСТЭМУ»

## Прэзідэнт правёў сустрэчу з намеснікам Дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы Сяргеем Глазьевым

Як праінфармаваў Аляксандр Лукашэнка, рашэннем кіраўнікоў Беларусі і Расіі Сяргей Глазьеў змяніць Дзмітрыя Мезенцава на пасадзе Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы.

### «ДУМАЮ, ШТО ЭФЕКТ БУДЗЕ ДОБРЫ»

«Мы дамовіліся з Уладзімірам Уладзіміравічам Пуціным, што ваш унёсак у будаўніцтва Саюзнай дзяржавы павінен быць важкім, — адзначыў беларускі лідар. — Ён добрай думкі аб вас. Маё меркаванне вы даўно ведаеце. Таму мы вызначыліся. У сувязі з тым, што заканчваецца тэрмін знаходжання на гэтай пасадзе Дзмітрыя Фёдаравіча Мезенцава і ён сыходзіць на іншую работу» (Дзмітрый Мезенцаў прызначаны паўнамоцным прадстаўніком Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі ў Канстытуцыйным судзе РФ).



Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што рух да больш цеснага саюза паміж Беларуссю і Расіяй павінен грунтавацца перш за ўсё на эканоміцы. «Вы — эканаміст, я лічу, ад Бога, — звяртаючыся да Сяргея Глазьева, адзначыў Прэзідэнт. — Многае ў вас (ёсць у плане прафесійных навыкаў і вопыту. — **«Зв.»**) насуперак тым, хто думае інакш у нас або асабліва ў Расійскай Федэрацыі. Мы прынялі такое рашэнне аб прызначэнні вас кіраўніком і «маторам» нашай саюзнай інтэграцыі ў плане кіраўніцтва ўсім апаратам Саюзнай дзяржавы. Думаю, што эфект будзе добры».

Такога ж меркавання, па словах беларускага лідара, прытрымліваецца і кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой. «Паколькі ён служыў да нядаўняга часу паслом у Расійскай Федэрацыі і за гэты час вельмі добра засвоіў асноўныя кірункі нашай дзейнасці», — патлумачыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў перспектыве Сяргей Глазьеў азнаёміць яго як Старшыню Вышэйшага Дзяржсавета са сваім бачаннем, прапановамі, якія датычацца развіцця Саюзнай дзяржавы. «Вы ведаеце, што ў нас кансенсусам прымаюцца рашэнні, — удакладніў беларускі лідар. — Многае залежыць і ад таго, як мы «зварым гэту кашу» і прапануем расійскаму боку і Прэзідэнту Расійскай Федэрацыі. Ён накіраваны на тое, каб мы падтрымлівалі самыя цесныя адносіны».

Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на тым, што формула «Адзіная Айчына — дзве дзяржавы» — ідэя, якая рэалізуецца на справе. «У нас Айчына адна — ад Брэста да Уладзівастока, гэта падкрэсліваю яшчэ з тых часоў, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Так адбылося, што ў нас дзве дзяржавы існуюць. Будзем выбудоўваць адносіны. Я часта кажу: мы дастаткова разумныя людзі, каб выбудаваць адзіную сістэму ўзаемадзеяння, будаваць нашы адносіны нават больш цесна, чым ва ўнітарнай дзяржаве. Можа, занадта амбіцыйна, але, тым не менш, гэту задачу павінны вырашыць. У адваротным выпадку (вы бачыце, што адбываецца вакол нас) нам не быць і не існаваць».

Прэзідэнт падкрэсліў, што гэта папярэдняя размова з Сяргеем Глазьевым. «Мы з вамі сустрэнемся і грунтоўна яшчэ пагаворым, як нам дзейнічаць, — канкрэтызаваў ён. — Я на вас вельмі разлічваю. Чаго ўтойваць: ад вас будзе многае залежаць. І ад тых людзей, якія будуць з вамі працаваць у апараце нашага саюзнага будаўніцтва».

Сяргей Глазьеў, у сваю чаргу, выказаў удзячнасць за давер. «Прыкладу ўсе сілы і свае веды, кваліфікацыю для таго, каб тыя ідэі, якія былі закладзены ў аснову стварэння Саюзнай дзяржавы (роўныя ўмовы гаспадарання, роўныя правы грамадзян, агульныя механізмы развіцця, пашырэнне кааперацыі, супрацоўніцтва, стварэнне высокаканкурэнтаздольнай эканомікі, якая магла б развівацца апераджальнымі тэмпамі), былі рэалізаваны, што называецца, па апошнім слове эканамічнай навукі», — сказаў ён.

«Калі размаўлялі з Уладзімірам Уладзіміравічам, мы сышліся на тым, што вы са сваімі ідэямі былі каля вытокаў першых крокаў нашага саюза з Расіяй, яшчэ ў часы першага Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Таму нам вельмі важна, што вы гэта не проста памятаеце, а вы, можна сказаць, былі побач з гэтымі ідэямі, а можа быць, камусьці і падказвалі, як трэба дзейнічаць. Прынамсі, з вамі мы часта абмяркоўвалі многія пытанні».

### «САЮЗНАЯ ДЗЯРЖАВА — НАША ВЯЛІЗНАЯ КАНКУРЭНТНАЯ ПЕРАВАГА»

У размове з журналістамі Сяргей Глазьеў звярнуў увагу на тое, што Саюзная дзяржава функцыянуе ўжо чвэрць стагоддзя і за гэты час многае ўжо зроблена. «Фактычна гэта ядро інтэграцыйнага працэсу, дзе адпрацоўваюцца найбольш цесныя, тонкія і складаныя механізмы інтэграцыі, — адзначыў ён. — У нас не толькі агульная эканамічная прастора, але і агульныя праграмы развіцця. Рэалізаваны дзясяткі навукова-тэхнічных праграм, шмат праектаў у самых розных сферах. Можна сказаць, Саюзная дзяржава ідзе па той траекторыі, якая паслядоўна закладзена на працягу 25 гадоў».

Новыя рубяжы саюзнай інтэграцыі, па словах Сяргея Глазьева, вызначаюцца задачамі сучаснага этапу. «Гэта павышэнне эфектыўнасці работы, павелічэнне маштабу дзейнасці, стварэнне новых інтэграцыйных механізмаў, фарміраванне агульных інстытутаў і стратэгій развіцця, пашырэнне і паглыбленне кааперацыі, спалучэнне кан-

# «ДАВЯДЗЕЦЦА ВЕЛЬМІ МОЦНА ПРАЦАВАЦЬ»

Чацвер стаў яшчэ і кадравым днём у Палацы Незалежнасці. Новыя кіраўнікі з'явіліся ў рэспубліканскіх органах дзяржаўнага кіравання, дзяржаўнай арганізацыі, мясцовых выканаўчых і распарадчых органах. Абноўлены склад кіраўнікоў дыпламатычных прадстаўніцтваў Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы. Перастала быць вакантнай пасада памочніка Прэзідэнта — інспектара па Гродзенскай вобласці.

### «НАСТОЙВАЮ НА ТЫМ, КАБ РАБОТА ПАМОЧНІКА БЫЛА НАПРАМУЮ»

Намеснік старшыні Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Віталь Нявера прызначаны старшынёй Дзяржаўнага камітэта па маёмасці. Віталь Нявера праінфармаваў, што на розных пасадах займаўся пытаннямі распараджэння маёмасці, акцыянаваннем, уладальніцкім наглядам.

«Ты ведаеш, што там рабіць, — сказаў Прэзідэнт. — Але неяк у нас дзяржмаёмасць як бухгалтэрыя нейкая не гучала. Але гэта і ўрада віна, і наша ў тым ліку. Дзяржмаёмасць ёсць дзяржмаёмасць: у яе ўсё на ўліку».

«Ва ўсіх краінах ключавы орган», — пацвердзіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой.

«Таму я і кажу, што нам трэба працаваць тут бліжэй, — паставіў задачу Аляксандр Лукашэнка. — І дапамагаць. Мы гэты будзем рабіць. Толькі кажы, што трэба рабіць. Матусевіча (Дзмітрыя Матусевіча, які да назначэння намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта ўзначальваў Дзяржкамітэт па маёмасці. — **«Зв.»**) арыентавалі на тое, каб таксама дапамагаў і не сыходзіў. Ды і ўвогуле, што тут казаць, гэта і яго работа цяпер».

Памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектарам па Гродзенскай вобласці прызначаны Канстанцін Бурак, які дагэтуль займаў пасаду кіраўніка Апарата Савета Міністраў.

«Калісьці і табе трэба пакаштаваць гэтага хлеба, як Караеў (Юрый Караеў, губернатар Гродзенскай вобласці. — **«Зв.»**) калісьці, — адзначыў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да яго. — Але не забывайце, што ў нас там вялікі складнік — бяспека. Людзі добрыя там, моцныя людзі. Эканоміка вобласці таксама добрая і моцная. Караеў — чалавек старанны і таксама не слабы як кіраўнік. Я не хачу, каб вы там канфліктавалі, але вельмі спадзяюся, што сваё меркаванне ў памочніка будзе».

Гаворачы аб паўнамоцтвах памочнікаў кіраўніка дзяржавы ў абласцях, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта людзі Прэзідэнта. «Гэта вочы і вушы Прэзідэнта, — канкрэтызаваў ён. — Я настойваю на тым, каб работа памочніка была напрамую: калі нейкія пытанні сур'ёзныя — звяртайся, будзем вырашаць».

Беларускі лідар даручыў збіраць памочнікаў Прэзідэнта як мінімум раз у месяц, каб абмяркоўваць вострыя пытанні. «Каб мы бачылі шляхі далейшых дзеянняў, — патлумачыў Аляксандр Лукашэнка неабходнасць такой работы. — Няхай адзін раз у квартал або паўгода, як захочаце, але гэта павінна быць рэгулярна».

### «ТРЭБА, КАБ І ПРАДПРЫЕМСТВЫ ПАДСТАВІЛІ ПЛЯЧО»

Абнавілася кіраўніцтва і на адным з дзяржаўных прадпрыемстваў. Руслан Страхар узгоднены на пасаду генеральнага дырэктара ААТ «Магілёўскі завод ліфтавага машынабудавання» (дагэтуль займаў пасаду намесніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама).

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся цяперашняй сітуацыяй на прадпрыемстве, удакладніў, ці ўсе прадпрыемствы холдынгу працуюць на поўную магутнасць, наколькі яны эканамічна эфектыўныя.

Руслан Страхар праінфармаваў, што ўсе прадпрыемствы працуюць стабільна. «У цэлым холдынг «Магілёўліфтмаш» па мінулым годзе атрымаў каля 50 мільёнаў чыстага прыбытку», — канкрэтызаваў ён.

Прэзідэнт патрабуе зрабіць усё для таго, каб Магілёў быў прыгожым і ўтульным горадам. «Хоць Нарышкін (Сяргей Нарышкін, дырэктар Службы знешняй разведкі Расіі. — **«Зв.»**) нядаўна быў у вас у Магілёве, вельмі задаволены, здзіўлены, што ён такі, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Але Магілёў у нас адстае ад іншых абласных гарадоў. Я там доўга жыў студэнтам і не толькі студэнтам. Таму нядобра будзе, калі горад не прывядзём у парадак. Трэба зрабіць, як Падмікольле».

Па словах Прэзідэнта, людзі, асабліва моладзь, добра адзываюцца аб гарадскім парку культуры і адпачынку ў Магілёве. «Таму тут трэба, каб і прадпрыемствы падставілі плячо», — кажучы аб добраўпарадкаванні горада, рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

### «ВЫ СВЯДОМА ІДЗЯЦЕ ТУДЫ ПРАЦАВАЦЬ»

Шэраг прызначэнняў датычыцца мясцовай вертыкалі ўлады. Старшынёй Драгічынскага раённага выканаўчага камітэта ўзгоднены Сяргей Пачко (дагэтуль дырэктар ААТ «Аляксеевічы-Агра» Драгічынскага раёна), старшынёй Столінскага раённага выканаўчага камітэта — Аляксандр Пачко (дагэтуль старшыня Кобрынскага райвыканкама), старшынёй Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта — Аляксандр Майсяюк (дагэтуль старшыня Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў).

«Аляксандр Мікалаевіч (Пачко. — **«Зв.»**) з аднаго раёна пераходзіць у другі. А што так?» — пацікавіўся Прэзідэнт у новага старшыні Столінскага райвыканкама.

«Мне прапанавалі, я пагадзіўся, тым больш, Століншчына — мая радзіма, — адзначыў прызначэнец. — Тры гады таму прапанавана было ўзначаліць Кобрынскі райвыканкам. За тры гады ёсць станоўчыя вынікі. Калі браць па сельскай гаспадарцы, то дабавілі ўдой на адну карову больш за тону малака за тры гады. Валавая вытворчасць — больш за 100 тон у дзень дабаўлена. Цяпер раён вырабляе звыш 500 тон малака ў дзень. Па прамысловасці таксама ёсць вынікі, у тым ліку і па астатніх кірунках».

Прэзідэнт пацікавіўся, кім новаму кіраўніку Століншчыны даводзіцца Сяргей Пачко, якога прызначылі старшынёй Драгічынскага райвыканкама. Як высветлілася, яны родныя браты. Прэзідэнт спытаўся ў Сяргея Пачко аб справах у гаспадарцы, якую дагэтуль ён узначальваў.

У полі зроку кіраўніка дзяржавы — і праграма адраджэння Палесся. Ён удакладніў, што робіцца ў гэтым напрамку. «Століншчына далей уключана ў праграму па Прыпяцкім Палессі. Вельмі шмат было зроблена за папярэднюю пяцігодку, цяпер другі віток», — праінфармаваў Аляксандр Пачко.

«Гэта значыць, што вы свядома ідзяце туды працаваць. Асабліва цябе мы кідаем па ўсіх гарадах і сёлах», — канстатаваў беларускі лідар.

«Антыкрызісным мы яго называем менеджарам», — сказаў Дзмітрый Крутой, удакладніўшы, што Століншчына з'яўляецца самым спецыфічным раёнам краіны. Кажучы аб новым старшыні Кобрынскага райвыканкама, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта далажыў, што Аляксандр Майсяюк — таксама годны кандыдат, які дасканала валодае ўсёй сітуацыяй у раёне.

Новы кіраўнік і ў адміністрацыі Савецкага раёна Мінска. Гэту пасаду займае Аляксандр Шчаковіч, які дагэтуль з'яўляўся намеснікам старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

# КАБ ВЫБУДАВАЦЬ АДЗІНУЮ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ»


Фота БелТА.

курэнтных пераваг, — канкрэтызаваў ён. — Шмат канкрэтных практычных задач, дзе мы маглі б аб'ядноўваць нашы магчымасці, пашыраць і паглыбляць наш навукова-тэхнічны патэнцыял і выходзіць на перадавыя рубяжы, рэалізоўваць стратэгію апераджальнага развіцця, поўнасцю мабілізоўваючы нашы магчымасці».

Намеснік Дзяржсакратара звярнуў увагу на тое, што ўсе задачы і ўстаноўкі Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы арыентаваны на выкананне асноўных кірункаў у рэалізацыі Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. «Гэтыя кірункі ахопліваюць галіны навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, макраэканамічнай палітыкі, гарманізацыі заканадаўства, абароны правоў спажыўцоў, антыманапольнага рэгулявання, фарміравання агульных стратэгічных планаў развіцця па галінах прамысловасці — у нас вельмі прадметная і канкрэтная работа, — падкрэсліў ён. — Задачы, якія ставяцца нашымі урадамі, будуць паспяхова вырашацца».

Сяргей Глазьеў канстатаваў, што найважнейшым элементам супрацоўніцтва становіцца каапераця. «У сусветнай эканоміцы — турбулентнасць: разбураюцца тэхналагічныя ланцужкі, кожны імкнецца стварыць у сябе свае цэнтры кампетэнцый, — удакладніў ён. — Тое, што ў нас ёсць Саюзная дзяржава, якая можа аб'ядназь тысячы прадпрыемстваў для вырашэння амбіцыйных, маштабных задач, — наша вялізная канкурэнтная перавага».

Беларуская эканоміка, па словах намесніка Дзяржсакратара, вельмі адкрытая. «Яна жыве ва ўмовах міжнароднай канкурэнцыі, дзе ліберальнае атачэнне на Захадзе дэманструе зусім неліберальныя сёння тэндэнцыі і памкненні, — сказаў ён. — Таму нам трэба быць на вышыні, парыраваць гэтыя выклікі сучаснасці і абапірацца на перадавыя тэхналогіі, дзе дзяржава павінна працаваць разам з рынкам. Калі ўсё выбудавана аптымальна, то рынак працуе на павышэнне грамадскага дабрабыту».

## Аляксандр Лукашэнка зрабіў шэраг кадравых прызначэнняў

«Цікавае ў нас перамяшчэнне з прафсаюзаў у Савецкі раён», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка і спытаў, якія асноўныя прамысловыя прадпрыемствы знаходзяцца на тэрыторыі гэтага сталічнага раёна.

«Амкадор-Белвар», прадпрыемства «Прамсувязь», — канкрэтызаваў Аляксандр Шчаковіч.

«Май на ўвазе, я вельмі буду чакаць тваёго падключэння, — папярэдзіў прызначэнца кіраўнік дзяржавы. — З «Амкадорам» у нас вялікія праблемы. Трэба прывесці да прытомнасці гэта прадпрыемства і ні ў якім разе нельга загубіць. «Амкадор» — гэта вельмі перспектыўнае для нас і для Расіі прадпрыемства, на нашым агульным рынку вельмі важнае. Таму ўнікай сам».

Прэзідэнт удакладніў, кім па адукацыі з'яўляецца новы кіраўнік адміністрацыі Савецкага раёна. Як высветлілася, інжынер-метролаг.

«Ну і цудоўна! Тое што нам трэба, — лічыць Прэзідэнт. — Паспрабуй унікнуць. Інжынер — ён усюды інжынер. І ў Афрыцы, і ў нас. Таму ўнікай, бо ў найбліжэйшы час прыйдзецца вельмі моцна працаваць на «Амкадоры».

* * *

Акрамя таго, Прэзідэнт даў згоду на ўзгадненне Андрэя Канюшкі першым намеснікам міністра прамысловасці (дагэтуль намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама, які курыраваў пытанні эканомікі), Алены Печань — першым намеснікам міністра фінансаў (дагэтуль намеснік міністра фінансаў), Наталлі Шаўцовай — намеснікам міністра сельскай гаспадаркі і харчавання (дагэтуль намеснік старшыні праўлення ААТ «Агенцтва па кіраванні актывамі»), Юліі Бердніковай — намеснікам міністра працы і сацыяльнай абароны (дагэтуль кіраўнік Фонда сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны), Кірыла Машарскага — намеснікам міністра эканомікі (дагэтуль памочнік члена Калегіі (міністра) па канкурэнцыі і антыманапольным рэгуляванні ЕЭК).

Кадравыя змены — і ў дыпламатычных прадстаўніцтвах Рэспублікі Беларусь. Канстанцін Галоўка ўзгоднены на пасаду генеральнага консула Рэспублікі Беларусь у г. Гуанчжоў (КНР) (дагэтуль з'яўляўся консулам Генеральнага консульства Рэспублікі Беларусь у г. Шанхаі (КНР), Пётр Якімаў — на пасаду генеральнага консула Рэспублікі Беларусь у г. Шанхаі (КНР) (дагэтуль першы намеснік кіраўніка дзяржаўнай установы «Адміністрацыя Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень»).

**Вераніка КАНЮТА.**

## ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ПРАЦЫ Ў ТАНДЭМЕ, ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ СТАРЫХ ДАМОЎ І РАЗВІЦЦЁ ПРАДПРЫЕМСТВА ВА ЎМОВАХ КАНКУРЭНЦЫІ

Як адзначыў у размове з журналістамі **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Канстанцін БУРАК**, кіраўнік дзяржавы настройвае на прадуктыўную, камандную работу. «Самае каштоўнае, што я вынес з гутаркі з кіраўніком дзяржавы, — гэта сапраўды па-бацькоўску цёплае, усеабдымнае пажаданне, што надае такі каласальны зарад энергіі, які адразу хочацца рэалізаваць у добрых справах, учынках на карысць нашага народа, нашай любімай краіны».

Адказваючы на пытанні, наколькі метады работы Канстанціна Бурака падобныя да метадаў работы старшыні Гродзенскага аблвыканкама Юрыя Караева, памочнік Прэзідэнта па Гродзенскай вобласці адзначыў, што яшчэ рана казаць аб гэтым. «У службовай дзейнасці мы з губернатарам не перасякаліся, — патлумачыў ён. — Але паколькі мы афіцэры, мы аднолькава глядзім на многія рэчы, аднолькава падыходзім да пытання адказнасці, думаю, у нас не будзе пытанняў з узаемаразуменнем. Лічу, што ў гэтым тандэме мы будзем эфектыўна выконваць задачы, якія ставіць кіраўнік дзяржавы».

Канстанцін Бурак 26 гадоў прысвяціў ваеннай службе (у Камітэце дзяржбяспекі і Дзяржаўным сакратарыяце Савета бяспекі), пасля чаго перайшоў на грамадзянскую.

Па словах **старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Віталя НЯВЕРЫ,** у сваёй дзейнасці на новай пасадзе ён будзе падтрымліваць існуючы курс Дзяржкаммаёмасці. Акрамя таго, час не стаіць на месцы, таму ў работу ведамства будуць укараняцца новыя прагрэсіўныя тэхналогіі.

«У апошні час гэта ведамства адрозніваецца тым, што вельмі шмат увагі ўдзяляе лічбавізацыі многіх працэсаў, стварэнню баз даных, уніфікацыі заканадаўства, яго спрашчэнню, — канкрэтызаваў ён. — Усё гэта прыводзіць да таго, што дзяржава, з'яўляючыся захавальнікам самага вялікага рэсурсу — зямлі — фактычна атрымлівае максімальную аддачу, і гэтыя сродкі накіроўваюцца на далейшае развіццё краіны».

Віталь Нявера звярнуў увагу на тое, што сістэма Дзяржкаммаёмасці дастаткова шмат робіць у справе добраўпарадкавання. «Найперш гэта пастаўленая кіраўніком дзяржавы задача па навядзенні так званага інвентарнага парадку на зямлі, — канкрэтызаваў ён. — Участкі зямлі, якія не апрацоўваюцца або зараслі драўнянай і хмызняковай расліннасцю, па даручэнні кіраўніка дзяржавы інвентарызуюцца і пераводзяцца ў землі лясnога фонду».

Кажучы аб рабоце са старымі дамамі, Віталь Нявера адзначыў, што такія аб'екты выстаўляюцца на продаж праз Дзяржкаммаёмасць. Па яго словах, шмат фактаў, калі ў сельскіх населеных пунктах старыя хаты купляюцца за ўмоўную сімвалічную плату і набываюць другое жыццё.

Віталь Нявера падкрэсліў, што Дзяржкаммаёмасць не з'яўляецца тым органам, які пацвярджае правы на аб'екты нерухомай маёмасці або зямельныя ўчасткі. «Самае галоўнае, вырашаючы праблему дзяржавы, не ўшчаміць грамадзяніна ў правах, — заўважыў ён. — Чалавек па нейкай прычыне не абслугоўвае гэты дом, але ж гэта з'яўляецца яго ўласнасцю. І тут ідзе карпатлівая работа з боку сельвыканкамаў па ўстанаўленні ўсіх сваякоў, якіх-небудзь сувязяў, каб не ўшчаміць грамадзяніна ў яго правах».

**Генеральны дырэктар ААТ «Магілёўскі завод ліфтавага машынабудавання» Руслан СТРАХАР** адзначыў, што «Магілёўліфтмаш» з'яўляецца найважнейшым прадпрыемствам і для Магілёўскай вобласці, і для прамысловага комплексу Беларусі ў цэлым. «Кіраўнік дзяржавы нацэльваў на мадэрнізацыю, на развіццё ўсіх прадпрыемстваў, якія ўваходзяць у холдынг «Магілёўліфтмаш», — канкрэтызаваў ён. — Асобная ўвага была прысвечана ў цэлым добраўпарадкаванню, навядзенню парадку ў горадзе Магілёве».

Руслан Страхар звярнуў увагу на тое, што прадпрыемства рэалізуе сваю прадукцыю на вельмі канкурэнтным рынку. «Гэта прадпрыемствы ў тым ліку Кітайскай Народнай Рэспублікі і іншых краін, — удакладніў ён. — Суадносіны «цана — якасць» — найважнейшы момант. У гэтай канкурэнтнай барацьбе мы павінны прадставіць прадукт высокай якасці па прымальнай цане. А для гэтага патрэбна пастаянная мадэрнізацыя, укараненне тэхналогій і работа над выдаткамі. У комплексе ўсё гэта забяспечыць далейшае развіццё. Прадпрыемства цяпер рэалізуе адразу тры праекты ў шматлікіх кірунках, накіраваныя на стварэнне ўдасканаленых ліфтаў, новых электрарухавікоў, на развіццё прадпрыемства ў цэлым».

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА:**

*— Самае галоўнае цяпер для Беларусі і Зімбабвэ — не спыняцца. Так, мы маем пэўныя вынікі нашага супрацоўніцтва, але ў нас яшчэ шмат працы ў вашай краіне. Мы гатовыя рэалізаваць той план, які мы намецілі падчас майго візіту ў Зімбабвэ.*

***(1 снежня 2023 года падчас перагавораў з Прэзідэнтам Зімбабвэ Эмерсанам Мнангагвай.)***

# ВЕКТАР — НА ДАЛЁКУЮ ДУГУ

## Аляксандр Лукашэнка запрасіў Прэзідэнта Зімбабвэ Эмерсана Мнангагву наведаць Беларусь

Падчас візіту ўрадавай дэлегацыі ў Зімбабвэ на чале з намеснікам Прэм'ер-міністра Віктарам КАРАНКЕВІЧАМ адбылася сустрэча з Прэзідэнтам Зімбабвэ Эмерсанам Мнангагвай.

Прэзідэнту Мнангагве быў перададзены асабісты ліст Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з афіцыйным запрашэннем наведаць краіну ў маі 2025 года. Кіраўнік Зімбабвэ з удзячнасцю прыняў прапанову, пацвердзіўшы гатоўнасць да візіту, паведамілі ў прэс-службе знешнепалітычнага ведамства.

Асобна быў падкрэслены стратэгічны характар двухбаковых адносін, важнасць каардынацыі ў працідзеянні знешняму санкцыйнаму ціску, узаемная падтрымка на міжнародных пляцоўках, а таксама цёплыя асабістыя кантакты з беларускім лідарам. Эмерсан Мнангагва папрасіў перадаць Аляксандру Лукашэнку найлепшыя пажаданні і выказаў упэўненасць у поспеху маючай адбыцца сустрэчы ў Беларусі.

Бакі абмеркавалі таксама прыярытэты двухбаковага супрацоўніцтва, уключаючы рэалізацыю трэцяй фазы праграмы механізацыі сельскай гаспадаркі Зімбабвэ з выкарыстаннем беларускай тэхнікі.

Як пракаментаваў вынікі візіту намеснік Прэм'ер-міністра Віктар Каранкевіч, бакі абмеркавалі і новыя праекты магчымага выкарыстання тэхналогій і кампетэнцый беларускіх прадпрыемстваў па перапрацоўцы цвёрдых камунальных адходаў, магчымасці далейшага пашырэння зборкі аўтобусаў і пастаўкі машынакамплектаў.

Ён дадаў, што ў Зімбабвэ плануецца пастаўка абсталявання і машынакамплектаў Мінскага аўтамабільнага завода, зборка якіх будзе ажыццяўляцца на месцы. На думку віцэ-прэм'ера, гэта таксама дэманструе ўзаемную цікавасць да рэалізацыі сумесных праектаў у галіне прамысловай кааперацыі.

Віктар Каранкевіч паведаміў, што падчас урадавага візіту асаблівая ўвага ўдзялялася і далейшаму развіццю сферы адукацыі, аховы здароўя і культуры.

— Таму кірункаў для раскрыцця патэнцыялу ўзаемадзеяння двух бакоў вельмі шмат, — падсумаваў віцэ-прэм'ер.

Ён падкрэсліў, што Беларусь нацэлена на хуткае і дакладнае выкананне ўсіх задач, якія вызначылі кіраўнікі дзяржаў.

**У тэму**

### Беларуская тэхніка ў Зімбабвэ: старт маштабных паставак

У рамках візіту Віктара Каранкевіча ў Харарэ зімбабвійскаму боку перададзена сельскагаспадарчая тэхніка, у ліку якой 7 камбайнаў «Гомсельмаш» і 189 трактароў МТЗ.

Як запэўнілі ва ўрадзе, гэта толькі пачатак. У рамках рэалізацыі трэцяга этапу праграмы механізацыі сельскай гаспадаркі Зімбабвэ плануецца паставіць 80 збожжаўборачных камбайнаў, 3491 трактар і 30 самазвалаў-збожжавозаў з прычэпамі.

АКТУАЛЬНА

# РОБАТАКСІ Ў МІНСКУ І БЕСПІЛОТНІКІ Ў ГАРАДЫ-СПАДАРОЖНІКІ?

## У Доме ўрада ўчора абмяркоўвалі навацыі ад Яндэкса

Сустрэчу правёў Прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН, які падкрэсліў: «Для мяне Яндэкс — гэта ў меншай ступені таксі», акцэнтуючы ўвагу на магчымасцях гэтай кампаніі ў сферы штучнага інтэлекту.

— Яндэкс — адна з вядучых у свеце тэхналагічных кампаній, уключаючы штучны інтэлект. І таму мы просім нас разглядаць не толькі як прадстаўніцкоў таксі, — акцэнтаваў увагу напачатку сустрэчы **саветнік па карпаратыўным развіцці Яндэкса Аляксей Кудрын.**

— Для мяне, шчыра кажучы, Яндэкс — у самай меншай ступені таксі, — адказаў на гэта Прэм'ер-міністр.

У сваю чаргу саветнік па карпаратыўным развіцці кампаніі падкрэсліў:

— Мы можам рабіць больш у інтарэсах Беларусі і Расіі.

У прыватнасці, Аляксандр Турчын і Аляксей Кудрын абмеркавалі перспектывы прымянення ў Беларусі перадавых тэхналогій кампаніі ў галіне штучнага інтэлекту. Ключавыя ініцыятывы, агучаныя ў ходзе гутаркі — магчымасць запуску беспілотнага транспарту паміж гарадамі-спадарожнікамі, укараненне робатаксі ў Мінску, аказанне паслугі па арэндзе аўтамабіля, абсталяванага прыладай максімальнага кантролю стану кіроўцы, для тых, хто хоча атрымаць дадатковы заробак у таксі.

Па завяршэнні сустрэчы саветнік па карпаратыўным развіцці кампаніі расказаў, што бакі абмеркавалі, дзе Яндэкс можа быць карысным Беларусі ва ўзаемадзеянні як з прыватнымі, так і з дзяржаўнымі структурамі, і знайшлі падыходы:

— У першую чаргу разглядалі транспарт у розных яго формах з улікам павышэння бяспекі і выкарыстання штучнага інтэлекту. Гэта зручнасць для насельніцтва. Мы знайшлі агульную мову і будзем рухацца ў гэтым кірунку.

ПАДЗЕЯ

# МАГІЯ КІНО

## Задача — правесці фестываль «Лістапад» на вельмі высокім узроўні

Мінскі міжнародны кінафестываль ЛІСТАПАД

Пра гэта заявіў намеснік Прэм'ер-міністра Уладзімір КАРАНІК падчас першага пасяджэння аргкамітэта традыцыйнага кінафестывалю «Лістапад».

— Гэта падзея, якую з нецярпеннем чакае не толькі наша кінематаграфічная грамадскасць, але і звычайныя людзі. Гэта фестываль, які заваяваў сваё годнае месца ў сэрцах гледачоў і прафесіяналаў, — падкрэсліў на пачатку пасяджэння віцэ-прэм'ер. — Ён дазваляе нашым грамадзянам дакрануцца да знакавых праектаў у галіне кінематографа. І наша задача — правесці яго на вельмі добрым арганізацыйным узроўні.

Уладзімір Каранік акцэнтаваў увагу ўдзельнікаў на тым, што на першым пасяджэнні неабходна вызначыцца з арыенціровачнымі датамі правядзення фестывалю, крытэрыямі адбору найлепшых стужак і намінацыямі.

Ён паведаміў, што арганізатары плануюць сумесна з СНД заснаваць новую намінацыю, для таго каб яшчэ больш узняць статус фестывалю, узняць цікавасць да яго.

Падчас пасяджэння ўдзельнікі абмеркавалі таксама месца правядзення фестывалю і магчымы склад журы:

— Каб максімальная колькасць гледачоў у максімальна камфортных умовах магла паўдзельнічаць у кінафестывалі. І ў першым набліжэнні (абмеркаваць. — **Заўв. аўт.**) прапанову аб складзе журы, разумеючы, што гэта пытанне, якое патрабуе дэталёвай прапрацоўкі. Гэта значыць, сёння першае ўстановачнае пасяджэнне аргкамітэта, дзе мы павінны вызначыць базавы момант і графікі нашых пасяджэнняў, каб да моманту фестывалю ўсе пытанні былі вырашаны і ён прайшоў на высокім арганізацыйным узроўні.

НАПЯРЭДАДНІ

# МІР, ЗГОДА, ПАВАГА

## Аляксандр РУМАК аб тым, як сустракаюць найважнейшае свята праваслаўныя, каталікі, іўдзеі

Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў адзначыў, што Светлае Хрыстова Уваскрэсенне аб'ядноўвае беларусаў незалежна ад веравызнання і нацыянальнасці.

— Вялікдзень лічыцца галоўным хрысціянскім святам. Гэта свята адраджэння. Кожны год веруючыя хрысціяне ў віншаваннях жадаюць адзін аднаму абнаўлення і духоўнага ўмацавання. Таму і свята гэта заўсёды ўрачыстае для кожнага верніка», — сказаў Аляксандр Румак у размове з журналістамі БелТА.

Паводле яго слоў, Светлае Хрыстова Уваскрэсенне аб'ядноўвае ўсіх жыхароў Беларусі. У гэтым годзе так супала, што ў адзін дзень самае шануемае і радаснае свята царкоўнага календара, «свята свят», будуць адзначаць і праваслаўныя, і католікі, і прадстаўнікі евангельскіх цэркваў.

У гэты ж перыяд, на працягу тыдня, іўдзеі Беларусі і ўсяго свету адзначаюць сваё галоўнае рэлігійнае свята — Песах. Яно з'яўляецца напамінам аб адной з ключавых падзей біблейскай гісторыі — выхадзе яўрэяў з Егіпта.

— Супадзенне ў гэтых важнейшых для веруючых людзей падзей — сведчанне таго, што трэба жыць у міры і згодзе. Беларусь у гэтым плане дэманструе добры прыклад. Прадстаўнікі розных канфесій адчуваюць неабходнасць паважлівага стаўлення адзін да аднаго, прызнання кожнага чалавека, незалежна ад яго веравызнання або нацыянальнасці. Урачыстасць рэлігійнага яднання падштурхоўвае людзей да яднання ў соцыуме, у жыцці, — лічыць Аляксандр Румак.

Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пацвердзіў, што жыхары нашай краіны, з'яўляючыся прадстаўнікамі розных рэлігій і нацыянальнасцяў, жывуць і заўсёды жылі мірна і ў згодзе. Ён падкрэсліў, што ў падтрыманні гэтых асноў — вялікая роля дзяржавы.

— Безумоўна, паколькі дзяржава — гэта інстытут, які прызначаны арганізоўваць жыццё ў грамадстве так, каб паміж людзьмі розных нацыянальнасцяў, розных веравызнанняў была згода. Наша дзяржава садзейнічае падтрыманню ўзаемаадносін і дружбы, — упэўнены ён. Для гэтага пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў створаны міжканфесійныя і міжэтнічныя кансультатыўныя саветы.

— Дзяржава імкнецца да таго, каб людзі і розных веравызнанняў, і розных нацыянальнасцяў былі ў дыялогу адзін з адным. Каб яны, збіраючыся на адной пляцоўцы, чулі адзін аднаго, абмяркоўвалі пытанні, якія датычацца ўсіх, — адзначыў Аляксандр Румак.

У якасці прыкладу ўпаўнаважаны расказаў аб удзеле прадстаўнікоў розных веравызнанняў у пасяджэннях міжканфесійнага савета, на якіх абмяркоўваліся змяненні ў Канстытуцыю, што планаваліся на той момант.

— Мы бачылі і чулі адзінства прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў па пытаннях сямейных адносін, умацавання інстытута сям'і ў нашым грамадстве, захавання традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, якія важны і хрысціянам, і мусульманам, і іўдзеям, — сказаў ён.

# ЗА МІР, БЯСПЕКУ І СТАБІЛЬНАСЦЬ

## Наталля КАЧАНАВА на Міжпарламенцкай Асамблеі СНД — аб выбары беларускага народа

Гэтымі днямі ў Санкт-Пецярбургу праходзяць мерапрыемствы Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД. Беларускую парламенцкую дэлегацыю ўзначальвае Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.



Фота ТГ-канала Савета Рэспублікі

На міжпарламенцкай пляцоўцы, як заўсёды, — самыя актуальныя тэмы. Учора на міжнароднай канферэнцыі парламентарыі абмяркоўвалі неабходнасць выпрацоўкі адзінага падыходу ў супрацьстаянні кібератакам: тэрарызм усё часцей бярэ на ўзбраенне штучны інтэлект, і без заканадаўчых ініцыятыў змагацца з гэтым няпроста. Ідзе пошук балансу паміж інавацыямі і бяспекай.

Спікеры парламентаў учора прынялі ўдзел у пасяджэнні Савета МПА СНД пад кіраўніцтвам Старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Валянціны Матвіенка. На парадку дня кіраўнікоў парламентаў было абмеркаванне ўдзелу назіральнікаў ад Асамблеі ў маніторынгу прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі і парламенцкіх выбараў у Таджыкістане. Разглядзелі таксама правядзенне конкурсаў дыпломных праектаў на суісканне ўзнагарод МПА СНД. На Савеце абмеркавалі і правядзенне міжнародных самітаў, і святкаванне юбілею Вялікай Перамогі.

У сваім выступленні Наталля Качанава адзначыла, што Міжпарламенцкая Асамблея СНД — не толькі аўтарытэтны кансультатыўны орган Садружнасці, але і ўплывовая процівага заходнім грамадскім інстытутам, якія, манапалізуючы міжнароднае меркаванне, спрабуюць выдаць сябе за ісціну ў апошняй інстанцыі, ацэньваючы электаральныя кампаніі ў нашых краінах.

— Сёлета ў нашай краіне адбылася важная грамадска-палітычная падзея — выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, — нагадала спікер і акцэнтавала ўвагу на іх выніках. — Мы паказалі ўсяму свету згуртаванасць і адзінства нашага грамадства. У чарговы раз даказалі, што беларускі народ за мір, бяспеку і стабільнасць і кожны нясе адказнасць за свой выбар і адчувае гэта. На карысць Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі прагаласавала беспрэцэдэнтная колькасць выбаршчыкаў — каля 87 %. Гэта сведчыць аб усенароднай падтрымцы дзеючага лідара і палітычнага курсу, што праводзіцца ў нашай краіне, у аснове якога — людзі, справядлівае стаўленне да іх і суверэнітэт.

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла: выбары лідара дзяржавы — адпраўны пункт, калі «перапрашываецца» грамадская дамова:

**— Таму падчас правядзення выбарчай кампаніі ў дачыненні да любой краіны заўсёды ўзрастаюць рызыкі ўмяшанняў звонку. Каб іх не дапусціць, у Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, прынятай у мінулым годзе, з'явілася паняцце «электаральная бяспека» як адна з найважнейшых сфер бяспекі ў цэлым.**

Наталля Качанава канстатавала: у Беларусі сфарміраваны новы палітычны лад, новая мадэль народаўладдзя:

— Мы зацвердзілі праграму палітычнага развіцця. Пасля публічных дэбатаў на ўсенародным рэферэндуме прынялі абноўленую Канстытуцыю, законы аб грамадзянскай супольнасці і палітычных партыях. У адзіны дзень галасавання правялі выбары дэпутатаў у Парламент і мясцовыя Саветы дэпутатаў, у новым канстытуцыйным статусе адбыўся Усебеларускі народны сход.

Спікер Савета Рэспублікі асабліва адзначыла, што ў гэту прэзідэнцкую кампанію ў дэструктыўных сіл не было аніякага шанцу ўмяшацца ў працэс:

— Мы выбудавалі надзейную сістэму абароны ад знешняга ўплыву. З кожным новым палітычным этапам імунітэт да любых правакацый у беларусаў толькі ўзрастае.

Яна выказала ўпэўненасць, што ў гэтым ёсць і вынік цеснага міжпарламенцкага супрацоўніцтва:

— Бо кожная электаральная кампанія — гэта ўнікальны вопыт для арганізатараў, удзельнікаў і назіральнікаў, аўтарытэтныя меркаванні і ацэнкі якіх у тым ліку выкарыстоўваюцца для «шліфоўкі» нацыянальнага заканадаўства.

Дарэчы, гэтым разам за выбарамі ў Беларусі назіралі каля 44 тысяч нацыянальных і амаль 500 міжнародных назіральнікаў з 52 краін. Для назіральнікаў дзверы былі адчыненыя ва ўсіх рэгіёнах і на ўсіх выбарчых участках.

Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу на тым, што ў цывілізаваным свеце расце запыт на адкрытасць, справядлівасць і адказнасць:

— Абараняючы свой электаральны суверэнітэт, мы не прыдумляем нешта новае і экстраардынарнае. Выпрацоўка адзінага падыходу па недапушчэнні ўмяшання ва ўнутраныя справы суверэнных дзяржаў і падтрымка палітычных пераўтварэнняў у нашых краінах — вось задача Міжпарламенцкай дыпламатыі. І калектыўнай сілай мы гэта выконваем.

*Падрабязнасці — у наступным нумары.*

# У ФАРМАЦЕ ДЫЯЛОГУ

Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Сяргей ХАМЕНКА з рабочым візітам наведаў Навагрудак. Віцэ-спікер Савета Рэспублікі сустрэўся з працоўным калектывам Навагрудскага завода металавырабаў.

Падчас сустрэчы абмяркоўвалі вельмі актуальныя на сёння тэмы: подзвіг беларускага народа падчас Вялікай Айчыннай вайны і спробы яго абясцэніць з боку дэструктыўных сіл. Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі таксама ўзяў удзел ва ўрачыстай цырымоніі ўскладання кветак да памятнага месца, дзе ў ліпені 1944 года пры вызваленні Навагрудка загінуў танкавы экіпаж Чырвонай Арміі, і ў закладцы Алеі Памяці ў гонар 80-годдзя Вялікай Перамогі. Віцэ-спікер таксама сустрэўся з навагрудскімі кадэтамі.

Падчас паездкі Сяргей Хаменка азнаёміўся з вытворчасцю на Навагрудскім заводзе металавырабаў, а таксама з ходам рэалізацыі інвестыцыйнага праекта «Арганізацыя вытворчасці металаканструкцый» па праграме «Адзін раён — адзін праект».

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

# «НАША ГАЛОЎНАЯ ІДЭАЛОГІЯ: РАЗАМ — ЗА МОЦНУЮ І КВІТНЕЮЧУЮ БЕЛАРУСЬ!»

## У Мінскім аблвыканкаме адбылася сустрэча з дэлегатамі УНС ад сталічнага рэгіёна

На ім дэлегаты абмеркавалі важнейшыя аспекты развіцця краіны і рэгіёна ў цэлым. Мэта такіх сустрэч — падрыхтоўка ўдзельнікаў сходу, каб яны маглі максімальна выканаць свае функцыі, пазначаныя ў Канстытуцыі, Законе «Аб Усебеларускім народным сходзе», часовым рэгламенце: вызначэнне стратэгіі развіцця грамадства і дзяржавы, непахіснасці канстытуцыйнага ладу, пераемнасці пакаленняў, грамадзянскай згоды.

Дэлегаты УНС не па чутках ведаюць аб праблемах рэгіёна і прапускаюць іх праз сябе, заявіў **старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксей КУШНАРЭНКА.** Усебеларускі народны сход як найвышэйшы орган народаўладдзя валодае шырокім колам паўнамоцтваў, у тым ліку зацвярджае праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на пэўны тэрмін. «Я ўпэўнены, што кожны з нас разумее, якая адказнасць кладзецца на вас. Ідзе апошні год пяцігодкі. На наступным сённяшняй сустрэчы мы падвядзём папярэднія вынікі работы, прааналізуем, на што неабходна звярнуць першачарговую ўвагу, паглядзім, як сярод іншых рэгіёнаў выглядае Мінская вобласць», — звярнуўся губернатар да дэлегатаў.

Аляксей Кушнарэнка акцэнтаваў увагу на тым, што не чакае проста справаздач дакладчыкаў: «Кожны з нас працаваў на сваім рабочым месцы і ўнosіў свой уклад у развіццё краіны і вобласці. Кожны з нас павінен прааналізаваць сваю работу».

**Намеснік Старшыні Усебеларускага народнага сходу, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Мінскай вобласці Аляксандр КОСІНЕЦ** у размове з журналістамі паведаміў, што дата пасяджэння Усебеларускага народнага сходу будзе пазначана кіраўніком дзяржавы ў бліжэйшы час.

Падчас работы УНС будуць перш за ўсё разглядацца пытанні з Паслання Прэзідэнта беларускаму народу і парламенту, вынікі рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2021—2025 гады: «Не выключана, што мы падрыхтуем і зацвердзім Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2026—2030 гады. Прэзідэнтам пастаўлена складаная, але неабходная для выканання задача — мы павінны да 2030 года стаць моцнай, квітнеючай краінай, забяспечыць развіццё эканомікі, свой суверэнітэт, незалежнасць, каб годна жылі нашы людзі. У канчатковым выніку галоўная наша ідэалогія: разам — за моцную і квітнеючую Беларусь! Таму ўсе дэлегаты Усебеларускага народнага сходу актыўна ўключыліся ў сваю дзейнасць, і сёння мы можам сказаць, што УНС выконвае ўскладзеныя на яго народам функцыі».

Аляксандр Косінец паведаміў, што дэлегаты пачалі інтэнсіўную работу: «Прэзідыум Усебеларускага народнага сходу зацвердзіў арганізацыйную структуру, якая дазваляе па рэгіянальных, галіновых і прававых прынцыпах ажыццяўляць цеснае ўзаемадзеянне кіраўніцтва УНС, розных органаў выканаўчай, заканадаўчай і судовай улады, рэгіёнаў, каб дабіцца добрых вынікаў у частцы падрыхтоўкі да УНС і выконваць свае функцыі».

Да сходу яшчэ ёсць час, але дэлегаты ўжо адчуваюць усю адказнасць і значнасць будучага пасяджэння. Упершыню выбраны дэлегатам УНС **намеснік начальніка аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі РАУС Бярэзінскага райвыканкама капітан міліцыі Максім КАШЛАЧОЎ** дзеліцца: «Удзельнічаць у такім маштабным і значным для дзяржавы і для нашага рэгіёна мерапрыемстве для мяне вельмі адказна і хвалююча, бо разглядаецца сацыяльна-эканамічнае развіццё нашай краіны ў цэлым і нашага рэгіёна. Для моладзі вельмі шмат робіцца, асабліва апошнім часам: і рабочыя месцы забяспечваюцца, і жыллё будуецца. У Бярэзінскім раёне моладзі ёсць дзе працаваць і дзе адпачыць, усё на годным узроўні развіваецца».

Усебеларускі народны сход — найважнейшая падзея ў жыцці краіны ў цэлым і для кожнага беларуса, лічыць **начальнік механазборачнага цэха на заводзе «Аўтагідраўзмацняльнік», старшыня Барысаўскага раённага аддзялення партыі «Белая Русь», дэпутат Барысаўскага райсавета дэпутатаў Дзмітрый СЛОНСКІ:** «Мяркуючы па матэрыялах, якія мы бачым, ідзе сур'ёзная падрыхтоўка да сходу. УНС стане важнай падзеяй у эканамічнай, ідэалагічнай, палітычнай сферах. Спадзяюся, наша краіна, дзякуючы рашэнням УНС, будзе прагрэсіўна развівацца і ісці наперад».

Апошні год адыходзячай пяцігодкі — самы час аценьваць атрыманы вынік, упэўнены **намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Дзяніс КУРЛЕНКА:** «Вынікі нас, прынамсі, цяпер радуюць. Мінская вобласць займае годнае месца ў краіне — валавы рэгіянальны прадукт складае амаль 19 % усяго ВУП. Чвэрць сельгаспрадукцыі, пятая частка прамысловай прадукцыі, чацвёртая частка інвестыцый, трэцяя частка ўсяго жылля, якое будуецца ў Беларусі, трэцяя частка ўсяго экспарту краіны — усё гэта Мінская вобласць».

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

**Фота тэлеграм-канала «Мінская вобласць/Пра галоўнае».**

zepter bank

**Закрытое акционерное общество «Цептер Банк»**

Адрес: 220034, г. Минск, ул. Платонова, 1Б,
эл. адрес: info@zepterbank.by
Тел. 331 89 49, факс 331 89 48

Данная финансовая отчетность размещена на сайте **www.zepterbank.by**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
31 марта 2025 г.**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 31.03.2025 | 01.01.2025 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 19 289 | 18 495 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 15 285 | 14 506 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 61 119 | 79 788 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 9 429 | 10 542 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 36 184 | 35 611 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 18 157 | 17 964 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 3 084 | 3 089 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 7 031 | 7 327 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 169 578 | 187 322 |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 5 348 | 11 309 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 102 857 | 116 656 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 57 | 62 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 1 382 | 1 089 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 109 644 | 129 116 |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 19 886 | 19 886 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 7 248 | 6 409 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 14 350 | 14 378 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 18 450 | 17 533 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 59 934 | 58 206 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 169 578 | 187 322 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
31 марта 2025 г.**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 31.03.2025 | 31.03.2024 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 1 734 | 1 444 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 324 | 276 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 1 410 | 1 168 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 2 361 | 1 650 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 670 | 852 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 1 691 | 798 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 2 446 | 2 451 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (54) | 434 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 464 | 553 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 3 465 | 2 775 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 109 | 161 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 2 491 | 1 600 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 763 | 426 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 1 728 | 1 174 |

Председатель Правления А.В. Игнатов

Главный бухгалтер О.В. Михалевич

Дата подписания: 01 апреля 2025 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь № 31 от 08 февраля 2024 г.
УНП 807000214

# ДОБРЫ ПЛЮС

## ВУП Беларусі за І квартал вырас на 3,1 %

Ажыццёўлена першая ацэнка валавога ўнутранага прадукту за І квартал 2025 года, паведамілі ў Белстаце. У прыватнасці, аб'ём ВУП у бягучых цэнах склаў 59,4 мільярда рублёў, або ў супастаўных цэнах 103,1 % да ўзроўню І квартала 2024 года.

Індэкс-дэфлятар ВУП у І квартале 2025 года ў адносінах да аналагічнага перыяду папярэдняга года склаў **106,4 %**.

Па даных Мінэканомікі, росту эканомікі спрыяла высокая дынаміка інвестыцый — **117,2 %** і рэальных наяўных грашовых даходаў — **112,5 %**.



У ролі асноўных драйвераў выступілі такія сферы, як будаўніцтва (тэмп **113,4 %**), інфармацыя і сувязь (**106,5 %**), гандаль (**104 %**), транспарт (**102,7 %**), прамысловасць (**102 %**).

У студзені — лютым 2025-га знешнегандлёвы абарот тавараў і паслуг Беларусі дасягнуў **14,7** мільярда долараў.

На 1 красавіка 2025 года золатавалютныя рэзервы Беларусі складалі **10,07** мільярда долараў, прычым прырост за сакавік склаў **7,04 %**.

Па выніках 2025-га прырост ВУП чакаецца на ўзроўні **4,1 %**, што перавышае сусветныя паказчыкі развіцця.

Паводле ацэнкі МВФ, тэмп прыросту сусветнай эканомікі ў 2025 годзе складзе **3,3 %**.



# ПАПРАЎКІ АД ЗЯМЛІ

## Урадам унесены карэкціроўкі ў сістэму цэнавага рэгулявання

Прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН падпісаў пастанову № 713 (7). Як паведамілі ў прэс-службе ўрада, для падтрымкі айчынных вытворцаў павялічаны гранічныя максімальныя адпускныя і рознічныя (аптовыя) цэны на бульбу свежую харчовую, за выключэннем мытай, капусту белакачанную свежую, за выключэннем ранняй, і цыбулю рэпчатую, за выключэннем чырвонай і белай. Гэта норма будзе дзейнічаць да 15 мая 2025 года.

Таксама павялічаны лімітная максімальная аптовая і гандлёвая надбаўкі (з улікам аптовай) на запасныя часткі да легкавых аўтамабіляў, якія вырабляюцца ў Рэспубліцы Беларусь.

Усе змены ўступілі ў сілу з 17 красавіка 2025 года.

# КРЭДЫТНАЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мяркуючы па ўсім, беларусы вырашылі да яе далучыцца. А можа дарэмна? У любой пазыкі ёсць вельмі непрыемная асаблівасць: што вінен — аддаць павінен. Ды яшчэ і з працэнтамі. Часам са стаўкай, якая «плавае» і можа павялічыцца ў самы непрыемны момант.

**Нядаўна Нацыянальны банк сваім валявым рашэннем вырашыў прытрымаць грамадзян ад апускання ў пазыковую кабалу і давёў банкам новыя ўстаноўкі: акцэнт зрабіць на інвестыцыйныя праекты, а партфель спажывецкіх крэдытаў вельмі рэкамендавана не нарошчваць больш, чым 12 %.**

Не буду спрачацца: крэдыт — штука прывабная. Толькі яго наяўнасць, ужо прабачце за шчырасць, сведчыць усё ж аб тым, што яго атрымальнік не ўмее абыходзіцца з грашыма. Я не з'яўляюся прынцыповым ворагам пазык. Але іх трэба браць з розумам, з эканамічным абгрунтаваннем і фінансавай выгадай для сябе. Яшчэ можна зразумець крэдыт на аўтамабілі ці нерухомасць. Вядома, давядзецца плаціць працэнты. Але, з іншага боку, прысутнічае і эканомія. Напрыклад, на тую самую арэнду жылля. Уласна кажучы, класічны рынак нерухомасці згасае, калі цана арэнды становіцца меншай, чым штомесячная плата па крэдыце за супастаўнае жыллё. Здараюцца нейкія перыяды спекуляцый, але ў цэлым мэтазгоднасць увязвання ў доўгатэрміновую пазыку ацэньваецца па гэтых суадносінах. І яно мае пад сабой цалкам лагічную аснову эканомнага і, калі заўгодна, скупога чалавека.

Але пазыкі на электроніку, бытавую тэхніку і іншыя не фантастычна дарагія рэчы — дзіўная з'ява. Калі людзям патрэбныя крэдыты на такія тавары, то яны занадта вольна абыходзяцца з грашыма, не ўмеюць імі карыстацца і зусім не кантралююць свае фінансавыя траты, дазваляючы сабе разбэшчанасць. Спасылкі на беднасць — ірацыянальнае апраўданне. Калі рэч не па кішэні, то адкуль возьмуцца сродкі аплаціць яе кошт, ды яшчэ з працэнтамі?! Калі падыходзіць з пункту гледжання фінансавай адукаванасці, то браць крэдыт увогуле немэтазгодна. А калі нейкі тавар вельмі хочацца, то трэба або больш працаваць, або больш эфектыўна расходаваць свой асабісты бюджэт.

Вядома, быць ашчадным або марнатраўным, збіраць грошы ці рабіць даўгі — асабістая справа кожнага. Спажывецкая дэмакратыя.

**Але летась на жыллё банкі выдалі 3,9 мільярда рублёў, а на спажывецкія патрэбы — 12,9 мільярда рублёў! Некаторыя так падселі на пазыкі, што ў фаст-фудзе і прадуктовай краме крэдыткамі і карткамі растэрміноўкі расплачваюцца!**

Зноў жа, ніхто не забараняе жыць па-гусарску. Тым больш, што грамадзяне нават вельмі дысцыплінаваныя пазычальнікі. Працэнт праблемных крэдытаў беспрэцэдэнтна невялікі. Але ў марнатраўства ёсць і іншы бок медаля — макраэканамічны. Каб камусьці грошы даць, неабходна, каб хтосьці гэтыя грошы банку даў. Іншымі словамі — паклаў на дэпазіт. Ашчадныя людзі ў краіне таксама не перавяліся. Беларусы захоўваюць каля 20 мільярдаў рублёў на дэпазітных рахунках. Быццам бы і нямала. Але больш чым удвая менш, чым бяруць у доўг.

А сёння такі ў эканоміцы момант, калі неабходна тэрміновая перабудоўвацца на новыя рэйкі. І паспрабаваць не проста трансфармавацца, а зра-

# УЛІЧВАЦЬ ТРЭНДЫ СУСВЕТНАГА РЫНКУ

## Стратэгія развіцця лёгкай прамысловасці павінна спрыяць пашырэнню асартыменту і павышэнню канкурэнтаздольнасці айчыннай прадукцыі

У гэтым выказаў упэўненасць міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР на сумесным пасяджэнні калегіі Мінэканомікі і ДКНТ з удзелам прадстаўнікоў канцэрна «Беллегпрам» па разглядзе праекта Стратэгіі развіцця лёгкай прамысловасці да 2035 года, якое адбылося днямі.



На думку кіраўніка эканамічнага ведамства, для дасягнення ўстойлівага і дынамічнага прагрэсу галіны недастаткова абмяжоўвацца мадэрнізацыяй абсталявання.

— Асновай стратэгіі павінны стаць праекты на аснове паглыбленай перапрацоўкі ўласнай сыравіны, кааперацыі з іншымі галінамі, прыватным бізнесам, а дынаміка яе мэтавых паказчыкаў — сінхранізавана з параметрамі НСУР-2040, — прыводзіць яго словы прэс-служба Мінэканомікі.

Як адзначыў Юрый Чабатар, канкурэнтаздольнасць прадукцыі вызначаецца не толькі коштам, але і дакладнай маркетынгавай стратэгіяй, якая ўлічвае перавагі спажыўцоў і трэнды сусветнага рынку:

**— Для беларускіх вытворцаў значны патэнцыял заключаецца ў лакальнасці вытворчасці, высокай якасці тавару і празрыстасці яго паходжання. Гэта фактары, якія сёння становяцца магутнай канкурэнтнай перавагай.**

Кіраўнік профільнага міністэрства звярнуў асаблівую ўвагу на неабходнасць выразнага бачання прасоўвання айчыннай прадукцыі на знешніх рынках і ўмацавання пазіцый на ўнутраным.

— У стратэгіі павінны быць вызначаны краіны, нішавыя сегменты, пляцоўкі, дзе беларуская прадукцыя мае перавагі і будзе запатрабаванай, — падкрэсліў ён.

# ПЯТЛЯ



біць рывок. Нашым прадпрыемствам патрэбная мадэрнізацыя, а для гэтага неабходныя фінансавыя рэсурсы. А банкаўскія крэдыты — адна з традыцыйных іх крыніц. Удумлівы чытач справядліва засумняваецца: чаму для грамадзяніна крэдыт — знак безгаспадарчасці, а для прадпрыемства?

Для бізнесу пазыковы капітал — зусім нармальная з'ява. Вядома, калі грошы трацяцца не на лімузіны кіраўнікам, рамонт іх кабінетаў і іншыя прадстаўнічыя патрэбы, а на тэхналогіі, абсталяванне, канструктарскія работы і іншыя мерапрыемствы, якія неабходныя для вытворчасці і атрымання прыбытку. Крэдыт тады эфектыўны, калі ён выдаткоўваецца не на канчатковае спажыванне, а на вытворчасць. Тады грошы, нават пазыковыя, працуюць і прыносяць прыбытак. Галоўнае, каб выгады перавышалі банкаўскі працэнт. Несумненна, можна беражліва збіраць з года ў год прыбытак і абыходзіцца ўвогуле без пазык.

У свеце камерцыі таксама можна жыць на ўласныя сродкі. Але вельмі рэдка так атрымліваецца. Калі ёсць добрая ідэя, цудоўная, запатрабаваная прадукцыя, даводзіцца хутка расці, каб заняць сваю долю рынку, забяспечыць максімальны прыбытак. І рабіць гэта хутка: пакуль месца не занята канкурэнтамі. Уласныя сродкі далёка не заўсёды дазваляюць развівацца імкліва. Таму і мэтазгодна прыцягваць грошы з боку. Так, даводзіцца плаціць працэнты. Але выгада ад хуткасці развіцця бізнесу перавышае кошт фінансавых рэсурсаў. У гэтым крыецца бізнес-логіка: грошы павінны працаваць. І эфектыўна працаваць. У адваротным выпадку крэдыты — зло для эканомікі. Зрэшты, пад сумнеўны праект ніводны банк грошай не дасць.

Беларуская эканоміка даволі ўстойлівая. Але не настолькі багатая, каб неэфектыўна выкарыстоўваць фінансавыя сродкі. Прынамсі, у вялікіх аб'ёмах траціць іх на спажывецкія забавы або амбіцыі. Сёння той момант, калі грошы як ніколі павінны эфектыўна працаваць. Таму Нацыянальны банк сваімі рашэннямі і імкнецца пераразмеркаваць рэсурсы ў бок інвестыцыйных пазык. Не, спажывецкія крэдыты не падпадаюць пад забарону ці абмежаванні. Але іх рост пастараюцца абмежаваць сёлета 12 працэнтамі. Што таксама нямала, улічваючы, што ў мінулым годзе яны выраслі на трэць. Да таго ж, за дужкі вынеслі крэдытаванне набыцця айчынных тавараў. Стымуляванне збыту сваёй прадукцыі — добрая гісторыя для развіцця эканомікі.

Калі казаць аб фінансаванні набыцця нерухомасці, то Нацыянальны банк плануе арыентаваць рынак на падтрымку набыцця новага жылля. Логіка зразумелая: попыт на новабудоўлі стымулюе будаўнічы сектар і яшчэ шмат іншых сумежных галін. Продажы на другасным рынку нерухомасці не ствараюць дабаўленай вартасці: проста грошы з кішэні пакупніка перамяшчаюцца ў кашалёк прадаўца. У гэтым выпадку грошы не працуюць.

**Выходзячы з гэтай логікі, рашэнні Нацыянальнага банка накіраваны на павелічэнне выдачы інвестыцыйных крэдытаў на 16 % больш, чым у 2024 годзе.**

Пакуль рашэнні толькі прыняты. Як яны будуць працаваць — будзем вывучаць.

**Інтэлект ШТУЧНЫ.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг»**

***проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества***

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

<table>
<tr><td>ЛОТ № 1</td><td colspan="5">Капитальное строение с инв. № 500/С-43164, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Кнорина, 50а. Площадь – 569,0 кв. м. Наименование – А1/м Здание специализированное складов. Назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 500/С-43166, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Кнорина, 50а. Площадь – 774,4 кв. м. Наименование – В1/м Здание специализированное складов. Назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 500/С-43165, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Кнорина, д. 50а. Площадь: 658,7 кв. м. Наименование – Б1/м-к Здание специализированное складов. Назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 500/С-43167, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Кнорина, 50а. Площадь – 47,9 кв. м. Наименование – Г1/к-кп Здание административно-хозяйственное. Назначение – Здание административно-хозяйственное. Составные части и принадлежности: литеры а, б – проезд; литер в – площадка; литер г – пешеходная дорожка; литер д – бордюр; литер е – калитка; литер ж – ворота; литер и – ограждение. Обременение: аренда.<br>Земельный участок с кадастровым номером 500000000009001119, площадью 0,7703 га, предоставленный ОАО «Н Холдинг» на праве аренды (срок действия по 31.03.2028).<br>На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): Земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, площадь 0,0268 га; Охранная зона ливневки, площадь 0,2440 га; Без права строительства новых и реконструкции существующих строений, площадь 0,7703 га; Обеспечить доступ для производства ремонтно-восстановительных работ эксплуатирующим организациям-владельцам инженерных коммуникаций, площадь 0,7703 га</td></tr>
<tr><td>Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN</td><td>1 136 839,50</td><td>Задаток, BYN</td><td>113 683,95</td><td>Шаг аукциона</td><td>5 %</td></tr>
<tr><td>Сведения о продавце/ организаторе аукциона, его местонахождение и контактные телефоны</td><td colspan="5">ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр. Машерова, 11, пом. 1. тел.: 8 017 284 94 32, 8 029 754 63 46 Мария, e-mail: arenda@h-holding.by</td></tr>
<tr><td>Срок подписания договора купли-продажи</td><td colspan="5">Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 10 (десяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона</td></tr>
<tr><td>Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона</td><td colspan="5">Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона</td></tr>
<tr><td>Условия оплаты</td><td colspan="5">Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (не резидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696.<br>Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона</td></tr>
<tr><td>Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе</td><td colspan="5">Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 15 мая 2025 включительно в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1</td></tr>
<tr><td>Место, дата и время проведения аукциона</td><td colspan="5">Аукцион состоится 19 мая 2025 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг»</td></tr>
<tr><td colspan="6">Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона</td></tr>
</table>



**ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ**

Объекта строительства «Возведение многоквартирного жилого дома со сносом капитальных строений с инвентарными номерами 500/С-28900, 500/С-28148, 500/С-28901 по ул. Ф. Скорины, 51 Б»,
*опубликованную в газете «Звязда» № 250 от 24.12.2024.*

**Сведения об этапах и сроках строительства:**
Срок начала строительства жилого дома – февраль 2024 года.
Предполагаемый срок завершения застройщиком строительства жилого дома и ввода его в эксплуатацию – апрель 2026 года.

УНП 100230470



Свидетельство о государственной регистрации и печать общества с ограниченной ответственностью «БелЭкоТурСервис» (УНП 590658879) **считать недействительными в связи с утерей.**


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!
Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі
ЗВЯЗДА
ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

ХРОНІКА Вялікай ПЕРАМОГІ


71 (7397)
СЕРАДА
18
красавіка 1945 г.
Цана 20 кап.


Войскі 2-га Украінскага фронта, прадаўжаючы наступленне, 17 красавіка авалодалі цэнтрам нафтаноснага раёна Аўстрыі— горадам Цыстэрсдорф.
Слава гераічнай Чырвонай Арміі!



## • На фронце

Паводле звестак Савецкага інфармбюро, на працягу 17 красавіка на Земландскім паўвостраве, на захад ад Кёнігсберга, войскі 3-га Беларускага фронту, прадаўжаючы наступленне, з баямі занялі горад і порт Фішхаузен і шматлікія населеныя пункты. «**Рэшткі разгромленай групы нямецкіх войск адкінуты у раён порта Пілау, дзе і знішчаюцца нашымі войскамі**», — паведамляла «Звязда».

У баях за 16 красавіка войскі фронту ўзялі ў палон 5 650 нямецкіх салдат і афіцэраў і захапілі наступныя трафеі: самалётаў — 47, танкаў і самаходных гармат — 47, бронетранспарцёраў — 78, палявых гармат — 385, мінамётаў — 210, кулямётаў — 730, аўтамашын — 2 512, трактараў і цягачоў — 64, чыгуначных вагонаў — 350, складаў з ваеннай маёмасцю — 36.

Войскі 2-га Украінскага фронту, прадаўжаючы наступленне, 17 красавіка авалодалі цэнтрам нафтаноснага раёна Аўстрыі — горадам Цыстэрсдорф, а таксама занялі больш за 30 іншых населеных пунктаў. На тэрыторыі Чэхаславакіі, на паўночным захадзе ад горада Гадонін, войскі фронту занялі населеныя пункты Крумвір, Шчытборыцэ, Кржэпіцэ, Густопечэ, Старовіцэ, Врановіцэ.

Войскі 3-га Украінскага фронту на тэрыторыі Аўстрыі, на поўначы і захадзе ад горада Санкт-Пельтэн з баямі занялі населеныя пункты Обер-Вельблінг, Амбах, Хаузгейм, Обрыцберг, Вайтцэндорф, Герэсдорф, Хафінг.


Ад Совецкага Інформбюро
АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 17 КРАСАВІКА
На працягу 17 красавіка на ЗЕМЛАНДСКІМ паўвостраве на захад ад Кенігсберга, войскі 3-га БЕЛАРУСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне, з баямі занялі горад і порт ФІШХАУЗЕН і населеныя пункты ЛІТАУСДОРФ, ГАФКЕН, ЗАНГЛІКЕН, НОЙЕНДОРФ, ДАРГЕН, ТЕНКІТЭН, КАЛЬКШТАЙН, ЛЕГІНЕН, РОЗЕНТАЛЬ, КАРЛЬСХОФ, ВІШРОДТ, БЛЮДАУ, НЕПЛЕКЕН, ЦЫМЕРБУДЗ, ПАЙЗЕ. Рэшткі разгромленай групы нямецкіх войск адкінуты у раён порта ПІЛАУ, дзе і знішчаюцца нашымі войскамі. У баях за 16 красавіка войскі фронта ўзялі ў палон 5.650 нямецкіх салдат і афіцэраў і захапілі наступныя трафеі: самалётаў — 47, танкаў і самаходных гармат — 47, бронетранспарцёраў — 78, палявых гармат — 385, мінамётаў — 210, кулямётаў — 730, аўтамашын — 2.512, трактараў і цягачоў — 64, чыгуначных вагонаў—350, складаў з ваеннай маёмасцю — 36.
Войскі 2-га УКРАІНСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне, 17 красав'ка

## • У тыле

На нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі ў Заслаўі старшыні сельсаветаў і калгасаў, брыгадзіры, звеннявыя, аграномы і работнікі МТС, партыйны і савецкі актыў раёна дзяліліся вопытам сваёй работы па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і першымі вынікамі масавых палявых работ.

Выступаў на ёй і трактарыст Навадворскай МТС таварыш Вайтовіч: «**Нашы трактары добра падрыхтаваны да палявых работ, — заяўляў ён. — Мы, трактарысты, будзем працаваць ад цямна да цямна, а калі спатрэбіцца, і ўначы і з гонарам выканаем узятыя на сябе абавязацельствы**».

Калгас імя VII з'езда Саветаў яшчэ зімой пачаў рыхтавацца да веснавых работ. Аб гэтым на нарадзе паведамляла яго брыгадзір таварыш Паркалёва: «**Загадзя былі адрамантаваны плугі, бораны, калёсы**». Дзякуючы чаму атрымалася своечасова выйсці на палі і засеяць першыя гектары яравых культур.

«**Мы не пашкадуем ні сілы, ні працы для паспяховага завяршэння сяўбы і атрымання ў гэтым годзе высокага ўраджаю**», — адзначала жанчына.

Раённая нарада абмеркавала і прыняла канкрэтныя абавязацельствы калгаснікаў і работнікаў МТС па ўздыме ўраджайнасці і паспяховым правядзенні ўсіх сельскагаспадарчых работ у 1945 годзе.

У прынятым дагаворы калгаснікі Заслаўшчыны, у прыватнасці, абавязваліся своечасова і высокаякасна завяршыць сяўбу яравых, зерневыя пасеяць за 7-8 дзён, бульбу пасадзіць за 10 дзён.

Нарада выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва калгаснікаў Мінскага сельскага раёна. «**Прысутныя на нарадзе прадстаўнікі ад калгасаў Мінскага раёна выклік прынялі**», — пісала «Звязда».

Цікавы факт: «**Нарада пастанавіла прасіць газету «Звязда» быць арбітрам у соцыялістычным спаборніцтве двух раёнаў**».

**Вядучая рубрыкі Яна ВАЛАСАЧ.**

# «Я САЛДАТ І ЗАСТАЮСЯ ВЕРНЫМ СВАЙМУ АБАВЯЗКУ»



Сімвалам нязломнай волі для некалькіх пакаленняў савецкіх людзей стаў генерал-лейтэнант інжынерных войск Дзмітрый Карбышаў.

Нарадзіўся ён 26 кастрычніка 1880 года ў шматдзетнай сям'і ў старажытным горадзе Омску. Там жа скончыў кадэцкі корпус, потым — Пецярбургскае ваеннае інжынернае вучылішча, Мікалаеўскую ваенна-інжынерную акадэмію. Падчас руска-японскай вайны паказаў сябе адважным і таленавітым афіцэрам-сапёрам, у 1911—1914 г.г. кіраваў рэканструкцыяй VII форта Брэст-Літоўскай крэпасці (пад яго кіраўніцтвам пабудаваны сховішчы, склады для боепрыпасаў і амуніцыі, абсталяваны пазіцыі для найноўшай артылерыі). У Першую сусветную вайну за адвагу пры штурме Пярэмышля і падчас Брусілаўскага прарыву Д. М. Карбышаў атрымаў званне падпалкоўніка і ордэн святой Ганны.

У 1918 годзе Дзмітрый Міхайлавіч уступіў у рады Чырвонай Арміі, у Грамадзянскую вайну арганізоўваў інжынернае забеспячэнне аперацый па разгроме войскаў Калчака і Урангеля.

...Вялікая Айчынная заспела Карбышава ў штабе 3-й арміі ў Гродне. Праз два дні ён перабраўся ў штаб 10-й арміі, які 27 чэрвеня трапіў у акружэнне. Ад прапановы камандарма выдзеліць транспарт і асабістую ахову для адпраўкі ў Мінск, а адтуль у Маскву генерал-лейтэнант наадрэз адмовіўся. У жніўні — пры спробе выйсці з акружэння — быў цяжка кантужаны і ў непрытомным стане захоплены ў палон.

...Яго пераводзілі з лагера ў лагер, умовы станавіліся ўсё больш жорсткімі, але зламаць Карбышава ворагі не змаглі: генерал катэгарычна адмовіўся перайсці на службу да фашыстаў. Ён заявіў, што яго перакананні не выпадаюць разам з зубамі ад недахопу вітамінаў у лагерным рацыёне. А калі даслоўна, то: «Я салдат і застаюся верным свайму абавязку».

Ноччу 18 лютага 1945 года ў аўстрыйскім канцлагеры Маўтхаўзен Дзмітрый Міхайлавіч быў па-зверску закатаваны: яго, распранутага, на лютым марозе фашысты з брандспойта аблівалі халоднай вадой.



Імем Героя Савецкага Саюза генерала Карбышава названы вуліцы і школы, піянерскія дружыны і атрады ў гарадах Беларусі і Расіі. Загадам міністра абароны Рэспублікі Беларусь генерал-лейтэнант Д. М. Карбышаў навечна залічаны ў спісы воінскай часці.

Запаветам для наступнікаў сталі яго словы: «Думайце аб сваёй Радзіме, і мужнасць вас ніколі не пакіне!»

**Мікалай ШАЎЧЭНКА,**
*г. Мінск.*

НІХТО НЕ ЗАБЫТЫ...

# «ДЗЕ ТАТАВА МАГІЛА, МЫ НЕ ВЕДАЛІ І НЕ ВЕДАЕМ...»

Кожны год у нашым Глыбокім праходзіць адмысловае свята — дзень, калі таты, можна сказаць, «адрываюцца»: бяруць удзел у спартыўных спаборніцтвах, спяваюць, дэманструюць розныя вырабы — паказваюць, што яны могуць. А могуць і сапраўды вельмі шмат: твары і тварыкі іх дзяцей простаззяюць ад радасці!
Тут міжволі ўспомніш і сябе, і тату.

*...Мне гадкі, можа, два ці тры. Лета. Сонца. Тата нясе мяне на адной руцэ, а на другой у яго нейкая чырвоная труба. Ён кажа, што гэта грамафон. Я не вымаўляю, каверкаю гэтае слова... Тата цалуе мяне і залівіста смяецца.*

*...А вось мы вяртаемся з вёскі Града ад бабулі з дзядулем. Я ўпершыню еду на цягніку, моцна тулячы да сябе прыгожую ляльку — падарунак таты. У акенцы ён паказвае мне бусла і сам выглядае вельмі вясёлым, бо нарэшце сабраў «да кучы» ўсю сваю сям'ю. У Віцебску нас чакае наш дом, кватэра, кветкі на клумбах, татавы гульні, апавяданні і казкі нанач. Мама кажа і выглядае вельмі шчаслівай, бо з фінскай вайны тата вярнуўся без ніводнай драпіны! Не тое што іншыя...*

*Пра іншых я не ведаю, але заўсёды рада, калі бацькі смяюцца ды мілуюцца.*

*Але ж гэта да пары, бо зноў я чую слова «вайна».*

*Праз многія дзесяцігоддзі ва ўсіх падрабязнасцях бачу той дзень і бачу яго так, быццам быў учора.*

*Тата з раніцы пайшоў на завод і вярнуўся ўжо з павесткай: на вакзал, да цягніка, які адпраўляўся на фронт, яму трэ было ісці ў той жа дзень.*

*Што тварылася ў нашай кватэры — словамі не перадаць! Мама хапалася за тату, абвісала на ім, трацячы прытомнасць. Ён «адліваў» яе, паіў вадой, хапаў на рукі то маленькую Зіначку, то мяне, то брата, усіх цалаваў і зноў кідаўся да мамы.*

*Потым мы пайшлі на вакзал. Тата нёс мяне на руках і ўвесь час супакойваў, казаў, што калі змог вярнуцца з фінскай вайны, дык абавязкова вернецца з гэтай; што Бог не пакіне сіротамі трох малых.*

*Каля цягніка было сапраўднае стоўпатварэнне: гул, гвалт, слёзы адчаю...*

*І раптам, усё заглушаючы, грымнула, пад самыя аблокі ўзнялася музыка — «Развітанне славянкі».*

*Пад гукі гэтага маршу ў падагнаныя вагоны садзіліся будучыя франтавікі.*




*Калі цягнік крануўся, жонкі, матулі, сёстры, каханыя, размахваючы сарванымі з галоў хусткамі, з плачам пабеглі следам.*

*...Мама з намі траімі апынулася ў так званых бежанцах, у маленькай вёсачцы Пальчыкі Сенненскага раёна. Жылі там па чатыры-пяць сем'яў у хаце. Ладзілі. Разам галадалі, хадзілі жабраваць. І гэта былі яшчэ кветачкі, бо потым пачаўся тыф: людзі вымiралі сем'ямі. За вёску на падводах кожны дзень вывозілі новыя дамавіны — і вялікія, і маленькія.*

*У такой пахавалі нашу Зіначку, а маму неяк выхадзілі манашкі.*

*...Мы разам чакалі Перамогі. Нам, малым, дарослыя казалі, што нашы таты ўсё ж мацнейшыя за немцаў, што «загонюць» гэтых сабак у іхнюю Германію і будуць вяртацца дамоў — нідзе не дзенуцца...*

*І яны сапраўды вярталіся (яшчэ да Перамогі): убачыўшы чалавека ў вайсковай форме, мы, малыя, кідалі ўсе гульні, выбягалі на дарогу і глядзелі ў той бок, адкуль ішоў нечы тата...*

*Мой, наш з вайны не прыйшоў, не выканаў свайго абяцання.*

*Сярод прозвішчаў тых, каго прызываў Віцебскі гарваенкамат і хто дамоў не вярнуўся, ёсць яго прозвішча — Максім Іосіфавіч Гапееў. А дзе ён пахаваны, мы не ведалі і не ведаем: кветкі носім да чужых брацкіх магіл у спадзеве, што нехта, недзе пакладзе свой букет і на татаву.*




**Зоя НАВАЕНКА,**
*г. Глыбокае.*

# ТЫДЗЕНЬ УЗНЁСЛАСЦІ

## «Натхнёныя Перамогай»: пяць адметных канцэртаў Міжнароднага Велікоднага фестывалю



Ён пачнецца ўжо ў панядзелак на святочным тыдні дзеля таго, каб падкрэсліць пераемнасць духоўных і творчых традыцый, распавяла Алена Куракіна, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

— Ідэя ў тым, каб прыцягнуць моладзь да светлага свята Вялікадня і да ідэалаў высокага мастацтва, перадаць ідэю сумеснай творчасці розных пакаленняў і ідэю развіцця нацыянальнага мастацтва. Трэці год фестываль атрымлівае высокае благаславенне мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага, Патрыяршага Экзарха усяе Беларусі Веніяміна. З таго часу канцэрты фестывалю адбываюцца ў храмавай прасторы. Ідэя натхнёнай творчасці паўстае ў Велікодным фестывалі рознымі гранямі, што адлюстравана ў назвах канцэртаў. Адметнасць у тым, што сёлета фестываль прысвечаны тэме Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

**Падкрэслівае сімвалізм перамогі духу (толькі ў мірным выяўленні) конкурс маладых кампазітараў, які ўпершыню пройдзе ў межах фестывалю з удзелам беларускіх і расійскіх творцаў.**

— Спаборнічаюць студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі, якія выявілі вялікую цікавасць да конкурсу. Таксама як і сябры журы — яны ў межах праграмы правядуць майстар-класы, — патлумачыў ад імя аргкамітэта конкурсу Ігар Комар, старшы выкладчык кафедры кампазіцыі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. — Папярэдне мы атрымалі 17 заявак, у наступны этап адабралі 12 твораў. Удзельнікі пісалі музыку паводле вершаў беларускіх і расійскіх аўтараў на ваенную тэматыку. Разглядаліся творы, напісаныя для харавых калектываў, і вакальныя нумары.

Найлепшых выберуць падчас фестывалю (адмысловая праграма адбудзецца 22 красавіка ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі). А імёны пераможцаў назавуць ужо на наступны дзень падчас гала-канцэрта «Сімфонія ў імя Перамогі» з удзелам студэнцкіх хароў нашай акадэміі музыкі і Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі. Месца ўзнагароджання тых, хто пісаў музыку, натхняючыся Перамогай, таксама сімвалічнае — Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

**Наогул, імпрэзы фестывалю сёлета пройдуць на розных вельмі знакавых пляцоўках. Так, адкрыццё 21 красавіка адбудзецца ў сценах Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, дзе выступіць студэнцкі камерны аркестр з праграмай «Сімфонія традыцый». На наступны дзень — «Сімфонія нашай Памяці», складзеная з ваенных песень, іх можна будзе паслухаць у Культурным цэнтры «Каўчэг» пры Свята-Елізавецінскім манастыры. Гала-канцэрт духоўнай музыкі пад назвай «Сімфонія ўзнёслага духу» адбудзецца 25 красавіка ў Храме-помніку ў гонар Усіх Святых і ў памяць аб ахвярах, якія паслужылі выратаванню нашай Айчыны.**




— Для нас вялікі гонар прымаць фінал Велікоднага фестывалю, — падкрэсліў іерэй Мікалай Поўны. — Радуемся магчымасці дыялогу на тэму духоўнасці і культуры, Вялікай Перамогі, тэма якой праходзіць праз усе святы гэтага года. Запрашаем наведаць Нацыянальны мемарыяльны комплекс — Храм-помнік у гонар Усіх Святых: уваход на канцэрт вольны для ўсіх.

Ахвотным патрапіць на іншыя канцэрты фестывалю трэба папярэдне запісацца (бо колькасць месцаў у залах абмежаваная). Але за гады існавання фестывалю (з 2017-га) людзі ведаюць яго асаблівасці і загадзя клапоцяцца пра тое, каб правесці святочны тыдзень узнёсла.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

**Открытое акционерное общество**
**«Небанковская кредитно-финансовая организация**
## «Белинкасгрупп»
(www.belincasgroup.by)

Форма 1

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
31 марта 2025 г.

Открытое акционерное общество
«Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 31.03.2025 | 31.12.2024 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 32 827 | 62 979 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 828 | 26 761 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 82 263 | 92 858 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | - | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 1 | 11 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 120 835 | 120 624 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 1 | 1 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 388 | 388 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 28 929 | 34 103 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 266 072 | 337 725 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 43 320 | 83 167 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 282 | 42 819 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 20 591 | 14 102 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 64 193 | 140 088 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 143 992 | 143 992 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 17 693 | 16 645 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 10 743 | 10 743 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 29 451 | 26 257 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 201 879 | 197 637 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 266 072 | 337 725 |

Форма 2

### ОТЧЕТ
### о прибылях и убытках
за период, начинающийся 1 января
и заканчивающийся 31 марта 2025 г.

Открытое акционерное общество
«Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 01.01.2025 – 31.03.2025 | 01.01.2024 – 31.03.2024 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 2 471 | 1 175 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 207 | 170 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 2 264 | 1 005 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 22 505 | 23 097 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 232 | 417 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 22 273 | 22 680 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | (437) | 68 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 112 | 1 080 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 33 825 | 33 795 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 51 252 | 48 560 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 2 | 35 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 6 559 | 7 873 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 2 317 | 3 164 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 4 242 | 4 709 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | | |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | | |

Председатель Правления А.Е. Назаренко

Главный бухгалтер Н.А. Ероховец

Дата подписания 2 апреля 2025 г.

УНП 807000270

# У РЫТМЕ СЭРЦА



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У рэдакцыю «Звязды» звярнуўся наш чытач з Мінска Анфім Іванавіч Міхалевіч, які перанёс аперацыю з прычыны анеўрызмы брушной аорты ў РНПЦ «Кардыялогія»:

— Пасля абследаванняў мяне накіравалі ў РНПЦ «Кардыялогія». Канчатковае рашэнне аб магчымасці аперацыі прымаў намеснік дырэктара па хірургічнай дапамозе Сяргей Спірыдонаў. Ён унік у сітуацыю і прыняў узважанае рашэнне. Рэнтгенэндаваскулярны хірург Павел Чарнаглаз правёў высокатэхналагічную аперацыю, мне ўстанавілі стэнт-графт. Гэта вельмі складаная і дарагая аперацыя, аднак сутнасць сацыяльнай накіраванасці нашай дзяржавы ў тым, што ўсё выконваецца за бюджэтныя сродкі. Словы нашага Прэзідэнта не разыходзяцца са справай — усё нацэлена на тое, каб якасць жыцця чалавека была высокай, а яна пачынаецца са здароўя. Аперацыя і аднаўленне праходзілі ў кардыяхірургічным аддзяленні № 1, якое ўзначальвае кандыдат медыцынскіх навук Аляксандр Жыгалковіч. Атмасфера дабра, шчырасці, прафесіяналізму медыкаў аддзялення літаральна вяртае людзей да жыцця, яна паскорыла і маё аднаўленне. Высокатэхналагічнае абсталяванне, якое закупіла дзяржава, каб аснасціць аперацыйныя, і прафесіяналізм дактароў і медыцынскіх сясцёр выратоўваюць жыцці і дапамагаюць аднавіць здароўе сотням людзей.

Карэспандэнты «Звязды « наведалі РНПЦ «Кардыялогія» і на свае вочы пераканаліся, чым унікальнае кардыяхірургічнае аддзяленне № 1.






## ЮВЕЛІРНАЯ РАБОТА

**Намеснік дырэктара па хірургічнай дапамозе РНПЦ «Кардыялогія» Сяргей СПІРЫДОНАЎ** падкрэслівае, што цэнтр актыўна развіваецца. Адзін з перспектыўных напрамкаў — гібрыдная хірургія. У цэнтры аснашчаны абсталяваннем экстра-класа дзве гібрыдныя аперацыйныя. Такая сумесная работа хірургаў эндаваскулярных і звычайных прыводзіць да паляпшэння вынікаў лячэння сардэчна-сасудзістых захворванняў.

— Мы развіваем адначасовую работу на некалькіх артэрыяльных басейнах. Напрыклад, стэнціраванне сонных артэрый без разрэзу і аортакаранарнае шунціраванне. Раней трэба было выконваць дзве аперацыі: рабіць разрэз на шыі, уводзіць гепарын, падключаць апарат штучнага кровазвароту, што суправаджалася кровастратай, цяпер іх замяніла адна аперацыя, — гаворыць Сяргей Спірыдонаў.

Развіццё атрымалі і такія сучасныя тэхналогіі, як пратэзіраванне аартальнага клапана. Гэта працэдура TAVI — транскатэтарная імплантацыя аартальнага клапана, якая выконваецца праз сцёгневую артэрыю без разрэзаў груднной клеткі. Яна не патрабуе падключэння апарата штучнага кровазвароту, што асабліва важна для ўзроставых пацыентаў. Аартальны клапан устанаўліваецца пад рэнгенкантролем, і чалавек праз 3-5 дзён вяртаецца да звычайнага жыцця.

## НЕ СМЯРОТНА

Пашыраюцца і тэхналогіі, якія дапамагаць пацыентам у тэрмальнай стадыі сардэчнай недастатковасці. Калі раней такі дыягназ гучаў як прыгавор, то сёння выкарыстоўваецца так званы механізм абходу левага жалудачка. Пацыенту ўстанаўліваецца спецыяльная кардыяпомпа, або штучны левы жалудачак, які дапамагае пашкоджанаму сэрцу пракачваць кроў па ўсім целе.

Усё больш аперацый сёння выконваецца праз маленькія доступы. Пры стэнозе аартальнага клапана амаль 80 % аперацый выконваюцца праз абмежаваную сцернатамію, калі на грудзіне робіцца невялікі разрэз усяго ў 7 см, праз які пратэзуюць аартальны клапан.

Увогуле ж колькасць высокатэхналагічных аперацый у РНПЦ «Кардыялогія» набліжаецца да 100 %. Штодзень кардыяхірургі выконваюць шэсць аперацый на сэрцы з падключэннем апарата штучнага кровазвароту, 6-7 аперацый у гібрыдных аперацыйных, як складаных, так і руцінных каранаграфій і стэнціраванняў, а таксама адну сасудзістую аперацыю. Нярэдкія аперацыі са спецыялістамі іншых навукова-практычных цэнтраў — РНПЦ дзіцячай хірургіі, МНПЦ хірургіі, трансплантalогіі і гематалогіі, РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі, РНПЦ «Маці і дзіця», РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава.

Што рабіць, каб захаваць сэрца здаровым? Сяргей Спірыдонаў раіць не курыць, мець пастаянныя доўгія фізічныя нагрузкі, напрыклад, бег, кантраляваць масу цела, сачыць за ўзроўнем цукру і халестэрыну ў крыві, а таксама артэрыяльным ціскам. Гэта тое, на што мы сапраўды можам уздзейнічаць, каб не трапіць да кардыяхірурга.

## НА СЭРЦЫ І НА САСУДАХ

Кардыяхірургічнае аддзяленне № 1 спецыялізуецца як на кардыяхірургіі, так і на сасудзістай хірургіі. Таму сюды шпіталізуюць пацыентаў як з паталогіяй сардэчных клапанаў і артэрый сэрца, так і з паталогіяй розных сасудзістых басейнаў, а таксама пацыентаў з парушэннямі сардэчнага рытму. Звычайна гэта ўзроставыя пацыенты, пераважна мужчыны.

— У нас выконваюцца аперацыі на соннай артэрыі, пры паталогіі нырачных артэрый, пры паталогіі артэрый ніжніх канечнасцяў. Аднак асноўная праблема, якой займаюцца ў нашым аддзяленні — атэрасклероз, пры якім адбываецца адкладанне халестэрынавых бляшак у розных артэрыях арганізма. Гэта заканамерна прыводзіць да таго, што па меры росту бляшак адбываецца закупорка сасудаў і з'яўляюцца сімптомы артэрыяльнай недастатковасці, — расказвае **ўрач-кардыяхірург вышэйшай катэгорыі кардыяхірургічнага аддзялення № 1 Раман ПЫЖЫК.** — Рэдка да нас паступаюць людзі, якія маюць пашкоджанні толькі аднаго сасудзістага басейна, паколькі атэрасклероз — гэта сістэмнае пашкоджанне ўсіх артэрый. Пацыент паступае з адным дыягназам па накіраванні, напрыклад, анеўрызмай брушной аорты, а калі мы яго паглыблена абследуем, выяўляецца бессімптомнае пашкоджанне іншых сасудзістых басейнаў.

